***У. Ф. Красюк,*** *канд. філас. навук, дац.,*
*дац. каф. філасофіі*

# «ВОЛЯ ДА ЖЫЦЦЯ І ВОЛЯ ДА КУЛЬТУРЫ» Ў ЛЮСТЭРКУ СУЧАСНАСЦІ

Вынесеныя ў загаловак словы М. Бярдзяева ўводзяць у праблему асэнсавання дынамікі развіцця культуры і адносін да яе як да феномена чалавечага быцця. «Трэцяя хваля» А. Тофлера, уваходжанне ў постіндустрыяльны этап развіцця цывілізацыі застаўляюць па новаму глянуць на разуменне культуры у пачатку XX ст., калі на яго аказала моцнае ўздзеянне праца О. Шпенглера «Захад Еўропы». Новае ў тым, што інфарматызацыя сённяшняга соцыуму, стварэнне невядомых раней форм культуратворчасці арыентуюць па-іншаму адносіцца як да традыцыйных падыходаў у вызначэнні зместу культуры, так і да саміх культурных традыцый. Асаблівасцю з’яўляецца тое, што скепсіс да гістарычнай сутнасці цывілізацыі, характэрны для пануючых меркаванняў стагоддзе назад, сёння з нагоды постмадэрнісцкіх выяў перарос у скепсіс да самой культуры. Культуры адмаўляецца ў анталагічнасці і грунтоўнасці, мастацтва ў крызісе і безвыходнасці. Для сучаснай беларускай культуры актуальнасць праблемы быційнасці ў тым, што яна шукае сваю самасць як у аспекце свайго месца ў рэчышчы XXI ст., так і ў плане ўспрымання, пераемнасці ідэй і традыцый века мінулага.

Якія ж пазітывы культуры бачылі філосафы ў пачатку XX ст.? У чым сёння сугучнасць ім?

Для вядомага рэлігійнага рускага філосафа М. А. Бярдзяева, чые ідэі знайшлі водгук у філасофскай думцы Беларусі, пытанне аб культуры і цывілізацыі – гэта пытанне аб лёсе, які нас чакае. А ён, калі спасылацца на О. Шпенглера, маркотны – лёсам культуры з’яўляецца цывілізацыя, а яна канчаецца смерцю культуры. Цывілізацыя – бездухоўная, тэхнічная, яна ёсць свята маманізму, які забівае духоўную культуру – свяшчэнную і сімвалічную.

Культура таму слабее і пераўтвараецца ў цывілізацыю, што слабее яе дух. Яе накіраванасць – у практычным ажыццяўленні магутнасці. Сапраўдным, рэальным «жыццём» становіцца не росквіт навук і мастацтваў, а практыка «жыцця». Нараджаецца напружаная воля да самога «жыцця», да асалоды «жыццём» і панавання над «жыццём».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. А. Бярдзяеў раскрывае механізм смерці культуры [2, с. 74]. Людзі перастаюць сузіраць святасць, цаніць вытанчанасць думкі, адухаўляць вышэйшыя пад'ёмы мастацкай творчасці. Цяпер на першым плане жаданне «жыць», будаваць «жыццё». Калі ў масах занадта распаўсюджваецца прага да «жыцця», тады мэта перастае ўвасабляцца ў вышэйшай духоўнай культуры, якая заўсёды раскрываецца ў якасці, а не ў колькасці. Культура перастае быць самакаштоўнай, а таму памірае воля да культуры. Людзі ўжо не хочуць незацікаўленага, бескарыснага сузірання, пазнання, творчасці. Культура страчвае сваю высокасць, яна падае, губляе сваю вышэйшую якасць, якая падаўляецца колькасцю. Адбываецца сацыяльная энтрапія, рассейванне творчай энергіі культуры. Культура не ажыццяўляе каштоўнасцей, мэт, задач. З гэтай думкай Бярдзяева пераклікаецца ідэя «паўстання мас» Х. Артэгі-і-Гасэта.

Духоўнасць у культуры – галоўнае для Бярдзяева. Культура ёсць ажыццяўленне новых каштоўнасцей, а не сродак ажыццяўлення новага быцця. Яе дасягненні не рэалістычны, а сімвалічны. Ісціны жыцця, дабра, прыгажосці, магутнасці, боскасці жыцця не ажыццяўляюцца, не рэалізуюцца ў культуры. Яна ажыццяўляе толькі ісціну ў пазнанні, у філасофскіх і навуковых кнігах; дабро – у норавах, побыце і грамадскіх устанаўленнях; прыгажосць – у вершах, карцінах, статуях, помніках архітэктуры, у тэатры; боскае – у кульце і рэлігійнай сімволіцы. Новае жыццё, вышэйшае быццё даецца толькі ў падабенствах, у вобразах, сімвалах. Іх ствараюць тварчыя акты.

М. А. Бярдзяеў пытае: дзе ж самое «жыццё»? У культуры як быццам не дасягаецца рэальнае пераўтварэнне. Што атрымоўваецца? Дынамічны рух унутры культуры з яе крысталізаванымі формамі няўхільна цягне да выхаду за межы культуры, да «жыцця», да практыкі, да сілы. На гэтым шляху і адбываецца пераход культуры ў цывілізацыю.

На погляд Бярдзяева, ва ўсякай культуры на нейкім этапе яе развіцця пачынаюць праяўляцца зародкі падрываў яе духоўных асноў. Культура звязана з культам, з рэлігійнага культу яна і развіваецца. Яна поўная свяшчэннай сімволікі, нават матэрыяльная культура ёсць культура духу, бо ўсякая культура мае духоўную аснову. Яна – прадукт творчай работы духа над прыроднымі стыхіямі. Аднак у самой культуры выкрываецца тэндэнцыя да распаду сваіх духоўных і рэлігійных асноў. Бярдзяеў упэўнены, што і антычная культура, і заходнееўрапейская праходзяць праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэс «асветы», якая рвецца з рэлігійнымі ісцінамі культуры і разлагае яе сімволіку. У гэтым фатальная дыялектыка культуры. Яна сама рыхтуе сабе пагібель, аддаляецца ад сваіх жыццёвых вытокаў, духоўна знясільвае сябе, рассейвае сваю энергію. Са стадыі «арганічнай» яна пераходзіць у стадыю «крытычную».

Філосаф падкрэслівае, што культура ёсць жывы працэс, жывы лёс народаў. Аднак пасля перыяду росквіту выяўляецца зрыў, унутры культуры выяўляецца занадта вялікая воля да новага «жыцця», да ўлады і моцы, да практыкі, да шчасця, да асалоды. Воля да магутнасці ёсць цывілізатарская тэндэнцыя ў культуры. Калі асвечаны розум змятае духоўныя перашкоды для выкарыстання «жыццём», калі воля да арганізаванага ўладання «жыццём» дасягае вышэйшай напружанасці, тады канчаецца культура і пачынаецца цывілізацыя. Вялікая філасофія і вялікае мастацтва, рэлігійная сімволіка больш не патрэбны – яны не прадстаўляюцца «жыццём». Адбываецца выкрыванне таго, што ўяўлялася вышэйшым у культуры. Перад судом рэальнага «жыцця» ў эпоху цывілізацыі духоўная культура прызнаецца ілюзіяй, самаабманам свядомасці, прывідным плодам сацыяльнай неарганізаванасці.

Цывілізацыю як этап гісторыі, які нясе пагібель культуры, Бярдзяеў не прымае. Тут пачынаецца культ «жыцця» па-за яго сэнсам. Пад цывілізацыяй разумеецца буржуазнае тэхнагеннае грамадства. У час панавання бяздушнай тэхнікі нішто ўжо не з’яўляецца самакаштоўным. Ні імгненні «жыцця», ні хваляванні «жыцця» не маюць глыбіні. На гэтым шляху не дасягаецца сапраўднае быццё чалавека, на гэтым шляху гіне яго вобраз.

Выйсце філосаф бачыць у вяртанні да духоўнасці. Унутры культуры можа ўзгарэцца і іншая воля да «жыцця», да пераўвасаблення «жыцця». Цывілізацыя – гэта не адзіны шлях пераходу ад культуры з яе трагічнай супрацьлегласцю «жыццю», да пераўвасаблення самога «жыцця». Пасля эпохі цывілізацыі павінен устанавіцца перыяд рэлігійнага пераўвасаблення. Так Бярдзяеў бачыць магчымасць выхаду чалавецтва з крызісу, магчымасць духоўнага рэнесансу. Менавіта так можна дасягнуць таго анталагічна-рэальнага пераўладкавання жыцця, каторага толькі сімвалічна дасягае культура і толькі тэхнічна дасягае цывілізацыя.

У Беларусі праблемы культуры, духоўнасці, у тым ліку паднятыя Бярдзяевым, знайшлі адлюстраванне ў творах і ідэях філосафаў, багасловаў, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў. Са сваімі поглядамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступіў выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі Д. Скрынчанка. У сваіх працах ён задае пытанне: «…што яўляе сабою жыццё сучаснага адукаванага грамадства? Што рухае яго? Чым, так сказаць, жыва душа сучаснага мыслячага чалавека?» І, аналізуючы сітуацыю, працягвае: «…нельга не бачыць… таго, што наша адукаванае грамадства блукае як бы ў цемнаце, імкнучыся ува што б то ні было выйсці ў ісцінны прасвет жыцця» [3, с. 328]. Гэта адбываецца таму, што культура грамадства стала апірацца на навуку, на «навейшую» філасофію, якія адхінулі хрысціанскае веравучэнне. «Індывідуальнасць, поўнае свабоднае развіццё асобы, – вось тыя пункты, што свецяцца, да якіх шпаркім крокам накіроўваецца сучасная культура» [3, с. 328–329]. Духоўнасць быцця падае, вывады «апошняга слова навукі», поўныя розных недарэчнасцей, маюць вынікам маральную дэмаралізацыю грамадства.

Д. Скрынчанка сцвярджае, што цяпер адукаваныя людзі, «так называемая ітэлігенцыя» ўсё «далей і далей» становяцца ад рэлігіі, ад духоўнасці. Маркотны такі стан грамадства, аднак, сцвярждае багаслоў, яшчэ маркотнее тое, што такое грамадства амаль не ўсведамляе сваёй памылкі і горда працягвае ісці сваім саманадзейным шляхам. Навука арыентуе на такія крыніцы і крытэрыі каштоўнасцей жыцця, як пачуццё задавальнення, асалода ад матэрыяльных даброт і гэтак далей, за што яна і крытыкуецца аўтарам.

Цэнтральным пытаннем духоўных пошукаў чалавека, а значыць і сутнасці культуры, Д. Скрынчанка ставіць пытанне аб сэнсе жыцця. Ён сцвярджае, што новая філасофія ў асобе Гартмана, Шапенгаўэра, Талстога і Ніцшэ не вырашае гэтую важнейшую праблему, падмяняючы яе пытаннем аб каштоўнасці жыцця. Даброты сучаснай цывілазацыі заглушаюць духоўныя прынцыпы, што ідуць ад Слова Божага, падрываюць волю да сапраўднага, сумленнага жыцця, вядуць чалавека да змрочнага погляду на яго і нават да насільнай развязкі з ім. Адназначна асуджаецца самагубства, якое ў тагачасным грамадстве «здараецца цяпер нярэдка». У гэтым бачыцца глыбокі крызіс культуры.

Д. Скрынчанка выступае супраць песімізму ў поглядах на культурнае жыццё, асуджае Я. Дзюрынга за матэрыялізм, які вядзе да задаволенасці матэрыяльнымі інтарэсамі ў жыцці. Выхад ён бачыць у вяртанні да сапраўднага жыцця грамадства, якое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўяўляецца ў духоўнай культуры, што бярэ пачатак ў хрысціанскай веры. Беларусам, піша аўтар «Адкрытага пісьма членам Дзяржаўнай думы і рускаму грамадству», трэба вярнуцца да ранейшай, праваслаўна-рускай свядомасці, трымацца старой праваслаўнай веры, што дапаможа выстаяць у бягучы няпросты час.

Цікавыя думкі аб акрэсленасці беларускай нацыянальнай культуры ў відавочны час крызісу еўрапейскай культуры на пачатку XX ст. выказаў І. Абдзіраловіч. Ён звяртае ўвагу на тое, што некаторыя крытыкі ў невыразнасці беларускай культуры хочуць бачыць духоўную смерць народа. Аднак, гаворачы аб гэтай невыразнасці, Абдзіраловіч адмаўляе, што у гэтым можна бачыць духоўную беднасць нашага народа, яго няздольнасць уласным крокам ісці да вытварэння ўласных форм жыцця. Прычына невыразнасці бачыцца ў «вялікай трагедыі народнага духу», якая была абумоўлена гістарычнай спадчынай, а менавіта: Беларусь дзесяць вякоў была «полем змагання» двух кірункаў еўрапейскай культуры – заходняга і ўсходняга. І калі і ў адной, і другой цяпер, па вядомым прычынам, пачаліся цяжкія парушэнні, паўстала пытанне аб выбары далейшага шляху.

Галоўным элементам, субстратам, носьбітам беларускай культуры бачыцца народ, бо «найбольш дрэнныя, духова-распусныя элементы нашага народа, як даўней – шляхта, а ў апошнія часы – частка страціўшай сувязь з народам інтэлігенцыі», уцяклі ад «беларускага карэння», пакінуўшы народ на свой уласны лёс. Народ застаўся жыць сам па сабе, духоўным жыццём. Народ, нягледзячы на хістанні «выразнай» культуры, захаваў незалежнасць свайго духу.

І. Абдзіраловіч адметна бачыць праблемы свайго часу, цяжкі стан еўрапейскай цывілізацыі Захаду і Усходу; выйсце ён бачыць у здаровым духу народа: «І вось зараз, калі набліжаецца вялікі крызіс датыхчасовых ідэалаў, калі ўся «культура» знаходзіцца ў небяспецы і гатова разваліцца ў руіны, беларускі народ – як быццам знімаюць з яго векавыя ланцугі – прабуджаецца да жыцця, да шукання новых ідэалаў, да стварэння новых падставаў чалавечага жыцця» [1, с. 9]. Воля да культуры і воля да жыцця зліваюцца ў адзіны паток.

Для Абдзіраловіча адназначна: культура будзе жыць заўсёды, пакуль народ будзе шукаць сваю «дарогу». Крызісу ў грамадстве

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можна пазбегнуць тады, калі «культура» (маецца на ўвазе тагачасная цывілізацыя як гібель культуры) сыдзе з высот «выразнасці» (сваёй абмежаванасці арыстакратычнымі формамі культур тытульных нацый імперый) да культуры народа, які, у сваю чаргу, не будзе шукаць свайго быцця на «чужых дарогах»: «Але зараз прыходзяць часы, калі багач зрабіўся бедаком (вынікі рэвалюцыі. – *У.К.*) і пойдзе на вялікі шлях шукаць з намі, гаротнымі, новага багацця, новага чалавечага ідэалу» [1, с. 9].

На пачатку XXI ст. беларуская нацыянальная культура аказалася ў няпростай сітуацыі, як, дарэчы, і многія іншыя культуры. Інтэграцыйныя і глабалізацыйныя працэсы, націск масавай культуры, наступленне электроннай цывілізацыі істотна змянілі як спосабы і працэс культуратворчасці, так і ўспрыманне яе прадуктаў спажывальнікамі. Таму праблемы, паднятыя мысліцелямі стагоддзе назад, сёння маюць актуальнасць у тым плане, што захоўванне духоўнай культуры, захоўванне на глебе пераемнасці нацыянальных традыцый павінны перасцерагчы ад бяздумных адносін да культурных каштоўнасцей, выпрацаваных народам. Скепсіс, пагарда да створанага продкамі ніколі не прыносілі добрых вынікаў. Мы жывём у эпоху бярдзяеўскай «цывілізацыі», калі наяўна «воля да жыцця» падаўляе «волю да культуры» – імкненне да максімальнага дабрабыту папулярнае ў грамадстве. У лепшым выпадку набыццё артэфактаў культуры яўна перавышае прагу да духоўнай вызначанасці культуры, каторая тым больш моцна паціскаецца рацыяналізаванай лічбовай камп'ютарнай дзейнасцю. Таму актуальны заклік Абдзіраловіча: шукаць патрэбныя формы «падставаў чалавечага жыцця», «сваю дарогу», «новы чалавечы ідэал». Створаная вякамі народам нацыянальная культура можа станоўча ўпісацца ў электронную цывілізацыю, калі «воля да жыцця» будзе ажыццяўляцца праз «волю да культуры». Думаецца, фатальнага супрацьстаяння паміж імі можа і не быць, калі адносіны да культуры не будуць чыста спажывецкімі. Адраджэнне культурнай спадчыны, дапоўненае пазітыўнымі напрацоўкамі сучаснай культуратворчасці, закладае той падмурак духоўнасці, які будзе адпавядаць патрабаванням часу і вызначаць «жыццё» інфармацыйнага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветапогляду / І. Абдзіраловіч ; прадм. С. Дубоўца. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Бердяев, Н. А.* Воля к жизни и воля к культуре / Н. А. Бердяев // На переломе. Философские дискуссии 20-х годов : Философия и мировоззрение / сост. П. В. Алексеев. – М. : Политиздат, 1990. – 528 с.

3. *Скрынченко, Д. В.* Ценность жизни по современно-философскому и христианскому учению / Д. В. Скрынченко // Философская мысль Беларуси : учеб. пособие / А. А. Козел. – Минск : Амалфея, 2004. – 352 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ